# ПАНЯЦЦЕ «НАЦЫЯНАЛЬНА-КУЛЬТУРНАЕ АДРАДЖЭННЕ» Ў АЙЧЫННАЙ ФУНДАМЕНТАЛЬНАЙ КУЛЬТУРАЛОГІІ

*С. С. Слюсар,*
*аспірант кафедры культуралогіі*
*Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта культуры і мастацтваў*

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

У сучаснай навуцы тэрмін «адраджэнне» разумеецца ў шырокім і вузкім значэннях. У шырокім значэнні гэты тэрмін абазначае этнакультурны пад’ём, рост нацыянальнай самасвядомасці, актывізацыю развіцця нацыянальнай культуры. У вузкім сэнсе тэрмін абазначае перыяд развіцця сусветнай, у першую чаргу еўрапейскай, культуры з канца XII ст. (Італія) да пачатку XVII ст. [9, с. 32].

Згодна з Энцыклапедыяй гісторыі Беларусі [1] адраджэнне ў шырокім значэнні – гэта заканамернасць у гістарычным развіцці народаў і пэўных рэгіёнаў, якая выяўляецца ў паскораным руху эканамічных, сацыяльна-палітычных і культурных працэсаў да больш высокіх форм грамадскага быцця і нацыянальнай самасвядомасці пасля працяглых перыядаў застою альбо ўпадку. Адраджэнне як заканамернасць перыядычных уздымаў грамадскага быцця і культуры пасля іх заняпаду выяўлялася пераважна ў тых народаў, гістарычныя працэсы якіх характарызаваліся перапыннасцю і катастрафічнасцю развіцця. У гэтым сэнсе само паняцце «адраджэнне» азначае менавіта нацыянальнае адраджэнне.

Гістарычны вопыт славянскіх народаў сведчыць, што за заняпадам альбо застоем нацыянальнай культуры ў спрыяльных ўмовах наступае перыяд уздыму, паскоранага развіцця, які называюць нацыянальным адраджэннем. Яго зыходным імпульсам заўсёды была генетычная памяць народа, увасобленая ў сімвалах, культурных здабытках і святынях, нацыянальнай мове.

Навуковец В. Лукін у сваім навучальным дапаможніку, які прысвечаны «Нашай Ніве» [7], тлумачыць адраджэнне як «заканамернасць у жыцці асобных народаў, якая выяўляецца ў паскораным руху да больш высокага ўзроўню грамадскага быцця, культуры і нацыянальнай свядомасці пасля перыяду застою або заняпаду» [7, с. 6]. Гэтае азначэнне вельмі падобнае да азначэння А. Луцкевіча, які пісаў, што адраджэнне – гэта «падняцце шырокіх народных мас на вышэйшую ступеню культурнага і грамадскага жыцця» [8, с. 6]. Гісторык А. Латышонак сцвярджае, што «працэс станаўлення сучаснай беларускай нацыі прынята называць “адраджэньнем”» [6, с. 395].

Якуб Колас як грамадскі і культурны дзеяч разумеў стратэгію адраджэння як паскораны рух эканамічнага, сацыяльна-палітычнага і культурнага працэсаў да больш высокіх форм грамадскага быцця і нацыянальнай свядомасці пасля працяглага перыяду застою [9, с. 121]. Шлях да дзяржаўнага і культурнага адраджэння Якуб Колас бачыў, калі адбывалася «адбудаванне гарадоў, пабудова новых фабрык і заводаў, шырокі творчы размах работы для буйнага росту эканомікі і прамысловасці, густая сетка школ розных тыпаў, вышэйшых навучальных і навуковых устаноў» [5, с. 64].

Відавочна, што праблема вызначэння тэрміна «нацыянальна-культурнае адраджэнне» непарыўна звязана з нацыятворчымі працэсамі і нацыянальнымі рухамі на адпаведнай тэрыторыі. Сярод першых даследчыкаў беларускага нацыянальнага руху вылучаецца адзін з яго пачынальнікаў – А. Луцкевіч. Ён стварыў тэорыю, згодна з якой ад моманту зараджэння «беларушчыны» ў XIX ст. існавалі дзве плыні – шляхецкія рамантыкі і дэмакраты-народнікі. Гісторыю руху ён падзяляе на тры этапы: першы, да 1904 г., калі «нацыянальная беларуская работа пачыналася і канчалася тым, што народу тлумачылі цэннасць і значэнне яго “простай” мовы»; другі прыпадае на рэвалюцыйны ўздым 1905 – першай паловы

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

1906 г., калі «рэвалюцыя, хаця толькі на адзін мамэнт, паставіла мужыка нараўне з усімі людзьмі», менавіта ў гэты час БСГ выпускае «сотні тысяч» улётак і шэраг «брашурак»; трэці – этап самаарганізацыі беларускай інтэлігенцыі, калі ўтвараюцца суполка «Загляне сонца і ў наша ваконца» і газета «Наша Ніва» і пачынаецца прапаганда ідэі беларускага нацыянальнага адраджэння [3, с. 88].

Гісторык У. Ігнатоўскі імкнуўся акадэмічна асэнсаваць вытокі нацыянальнага руху і нацыянальнай ідэі. На яго думку, нацыянальная ідэя як з'ява нарадзілася са спадчыны Французскай рэвалюцыі, другой крыніцай паўстання нацыянальных ідэалогій ён называе рамантызм. Храналагічна пачатак беларускага нацыянальнага руху і нацыянальнай ідэі гісторык выводзіць ад першай чвэрці XIX ст., ад моманту стварэння «беларускай школы» ў польскай літаратуры – творчасці і дзейнасці Я. Баршчэўскага, А. Рыпінскага і Я. Чачота [4, с. 86]. Погляды і ідэі дзеячаў эпохі У. Ігнатоўскі характарызуе ў дзвюх катэгорыях – сацыяльнай і нацыянальнай.

На думку польскага даследчыка Ю. Хлябоўчыка, у Заходняй Еўропе існавала практыка атаясамлення паняццяў «дзяржава» і «народ». Працэс стварэння нацый у краінах Заходняй Еўропы ён характарызуе з дапамогай наступнай схемы: дзяржаўная супольнасць – моўная супольнасць – нацыянальная супольнасць [11, с. 18].

У Цэнтральнай Еўропе назіраліся істотныя адрозненні ад вышэйапісанай схемы. Тут нацыянальная самасвядомасць ўзнікала не дзякуючы мэтанакіраванай дзяржаўнай палітыцы, а насуперак ёй. Паводле схемы Ю. Хлябоўчыка нацыятворчыя працэсы ў дадзеным выпадку адбываліся наступным чынам: моўная супольнасць – нацыянальная супольнасьць – дзяржаўная супольнасць. Ю. Хлябоўчык падзяляў нацыятворчы працэс «сялянскіх» народаў на дзве асноўныя фазы: культурна-моўную і палітычную [11, с. 56]. Галоўная задача першай фазы – апрацоўка і стандартызацыя літаратурнай мо-



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

вы для дадзенай этнічнай супольнасці. Змест другой фазы – прапаганда нацыянальнай ідэі і распаўсюджванне гістарычнай свядомасці сярод шырокіх мас насельніцтва, і ў першую чаргу сялянства.

Сярод сучасных даследчыкаў асаблівай папулярнасцю карыстаецца тэарэтычная мадэль фарміравання сучасных нацый чэшскага гісторыка М. Гроха. Ён адрознівае «дзяржаўныя» і «малыя» народы, якія мелі розныя варыянты нацыянальна-культурнага адраджэння. Нацыянальны рух малых народаў, да якіх М. Грох адносіў і беларусаў, праходзіць у сваім развіцці тры галоўныя фазы: навуковую (з'яўленне навуковай цікавасці да мовы і культуры сялянскай этнічнай супольнасці з боку інтэлігенцыі, стандартызацыя мовы, стварэнне гістарычных работ); фазу нацыянальнай агітацыі (дзейнасць патрыятычна настроенай інтэлігенцыі і актывістаў нацыянальнага руху з мэтай папулярызацыі нацыянальнай самасвядомасці сярод шырокіх мас сялянскага насельніцтва); фазу масавага палітычнага руху (нацыянальны рух набывае палітычны характар і падтрымку шырокіх слаёў насельніцтва) [12, с. 9].

На думку этнолага П. Церашковіча, становішча беларусаў на старце нацыятворчых працэсаў і адпаведна нацыянальна-культурнага адраджэння, выглядала найгоршым сярод усіх цэнтральна-ўсходнееўрапейскіх народаў [10, с. 198].

Выдавец і філолаг В. Булгакаў у сваёй кнізе «Гісторыя беларускага нацыяналізму» вылучае, што «слабасць уласна беларускага нацыябудаўніцтва тлумачыцца не адсталасцю беларусаў, а сілай і дзейснасцю больш ранніх і больш магутных нацыяналізмаў у Беларусі» [2, с. 310].

Такім чынам, пад нацыянальна-культурным адраджэннем мы можам разумець працэс абуджэння і фарміравання нацыянальнай самасвядомасці народа, які выяўляецца ў развіцці духоўнай культуры, імкненні ўзнавіць уласнае гістарычнае мінулае, абароне мовы і, нарэшце, узнікненні і развіцці руху

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

за аднаўленне сваёй дзяржаўнасці. Нацыянальна-культурнае адраджэнне заўсёды грунтуецца на ідэі нацыянальнай ідэнтычнасці. Канчатковай мэтай нацыянальна-культурнага адраджэння з'яўляецца стварэнне незалежнай нацыянальнай дзяржавы.

У працэсе нацыянальна-культурнага адраджэння можна вызначыць наступныя ўмоўныя этапы развіцця: фальклорна-этнаграфічны, літаратурны (культурны) і палітычны. На першым – фальклорна-этнаграфічным этапе невялікія групы навукоўцаў з мэтай пацвярджэння самабытнасці ўласнага народа збіраюць і вывучаюць гістарычныя дакументы, этнаграфічныя экспанаты, фальклорныя памяткі. Сутнасцю другога – літаратурнага ці культурнага этапу з'яўляецца адраджэнне мовы народа, барацьба за пашырэнне сферы яе ўжывання, асабліва ў літаратуры і адукацыі. Трэці – палітычны этап характарызуецца вялікім арганізацыйным аб'яднаннем нацыянальных сіл, з'яўленнем і ўмацаваннем іх палітычных арганізацый, усведамленнем нацыянальных інтарэсаў, актыўнай барацьбой за нацыянальнае вызваленне. У гэтых палітычных патрабаваннях прасочваецца жаданне народа дасягнуць спачатку хоць бы абмежаваных аўтаномных правоў, а ў перспектыве змагацца за стварэнне ўласнай незалежнай дзяржавы.

Характэрнай прыкметай нацыянальна-культурнага адраджэння з'яўляецца тое, што гэты працэс, як правіла, абапіраецца на дасягненні, традыцыі і вопыт папярэдніх пакаленняў. Беларускі нацыянальны рух з'явіўся ў цэнтральна-усходнеўрапейскім рэгіёне адным з позніх. Адсутнасць сацыяльнай базы, а таксама шэраг іншых грамадскіх, палітычных, культурных чыннікаў абумовілі яго слабое развіццё. Пры гэтым, нягледзячы на ўсе неспрыяльныя ўмовы, працэс беларускага нацыянальна-культурнага адраджэння быў запушчаны.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

*1.* Адраджэнне // Энцыклапедыя гісторыі Беларусі. – Мінск : Беларус. Энцыкл., 1997. – Т. 1. – С. 58–61.

*2. Булгаков, В.* История белорусского национализма / В. Булгаков. – Вильнюс : Ин-т белорусистики, 2006. – 331 с.

*3.* Гістарыяграфія гісторыі Беларусі канца XVIII – пачатку XX ст.: праблемы, здабыткі, перспектывы / Н. В. Анофранка [і інш.] ; навук. рэд. В. В. Яноўская. – Мінск : Беларус. навука, 2006. – 447 с.

*4. Ігнатоўскі, У.* Гісторыя Беларусі ў XIX і ў пачатку XX сталецця. лекцыі, чытаныя студэнтам Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэту / У. Ігнатоўскі. – 2-е выд., стэрэатыпнае. – Менск : Дзярж. выд-ва Беларусі, 1926. – 252 с.

*5. Колас, Я.* Збор твораў : у 14 т. / Я. Колас. – Мінск : Маст. літ., 1976. – Т. 11 : Публіцыстычныя і крытычныя артыкулы 1917–1946 гг. – 424 с.

*6. Латышонак, А.* Нацыянальнасць – Беларус / А. Латышонак ; навук. рэд. А. Пашкевіч. – 1-е выд. – Вільнюс : Ін-т беларусістыкі : Беларус. гіст. т-ва, 2009. – 558 с.

*7. Лукін, В. С.* «Наша Ніва» – цэнтр нацыянальна-культурнага адраджэння (1906–1915 гг.) : вучэб. дап. / В. С. Лукін. – Мінск : БДПУ, 2000. – 35 с.

*8. Навіна, А.* Пуцяводныя ідэі беларускае літэратуры / А. Навіна. Вільня : Наша думка, 1921. – 31 с.

*9. Смолік, А.* Беларуская культуралогія: гісторыя і сучаснасць / А. Смолік ; Мін-ва культуры Рэсп. Беларусь, Беларус. дзярж. ун-т культуры і мастацтваў. – Мінск : БДУКМ, 2014. – 276 с.

*10. Терешкович, П. В.* Этническая история Беларуси XIX – начала XX в. в контексте Центрально-Восточной Европы / П. В. Терешкович. – Мінск : БГУ, 2004. – 224 с.

*11. Chlebowczyk, J.* Procesy narodotwórcze we wschodniej Europie Środkowej w dobie kapitalizmu (od schyłku XVIII do początków XX w.) / J. Chlebowczyk. – Warszawa : Państwowe Wydawn. Naukowe, 1975. – 375 s.

*12. Hroch, M.* Małe narody Europy. Perspektywa historyczna / M. Hroch ; Przekład G. Pańko. – Wrocław – Warszawa – Kraków, 2003. – 168 s.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ